УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗЮВАНАЎ МІХАІЛ АКІМАВІЧ

**ОПЕРНЫ СПЯВАК, НАРОДНЫ АРТЫСТ БССР**

**24 ЛЮТАГА 1906 Г. – 29 КРАСАВІКА 1977 Г.**

# ЗЮВАНАВА ЯЎГЕНІЯ МІКАЛАЕЎНА

**БАЛЕРЫНА, ЖОНКА М.А. ЗЮВАНАВА**

**4 ЛЮТАГА 1928 Г.**

**ФОНД № 362**

**ВОПІС № 1**

**1942 – 1976**

**МІНСК 2019**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 362**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ М.А. ЗЮВАНАВА | 1-52 | 1-7 |
| 1.1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ М.А. ЗЮВАНАВА | 1-10 | 1-2 |
| 1.1.1. | ФАТАГРАФІІ М.А. ЗЮВАНАВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З ОПЕРНЫХ СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА ВЯЛІКАГА ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР | 1-8 | 1-2 |
| 1.1.2. | ДАКУМЕНТЫ ЎКЛАДАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ М.А. ЗЮВАНАВА | 9-10 | 2 |
| 1.2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ М.А. ЗЮВАНАВА | 11-25 | 2-4 |
| 1.2.1. | ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ ВЯЛІКІМ ТЭАТРЫ ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР І ІНШ. | 11-22 | 2-3 |
| 1.2.2. | АФІШЫ І ПРАГРАМЫ КАНЦЭРТАЎ | 23-25 | 4 |
| 1.2.3. | ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯ, ГРАМАТЫ І ІНШ. | 26-39 | 4-6 |
| 1.3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА М.А. ЗЮВАНАВА І ІНШ. | 40-47 | 6-7 |
| 1.4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 48-52 | 7 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ Я.М. ЗЮВАНАВАЙ | 53-59 | 8 |

## Прадмова

**Зюванаў Міхаіл Акімавіч** нарадзіўся 11 (24) лютага 1906 г. у г. Грозным у азербайджанска-грузінскай сям'і. У хуткім часе з бацькамі пераехаў у г. Баку, дзе паступіў у гімназію, пасля рэвалюцыі ператураную ў савецкую школу. Затым два гады працаваў слесарам на нафтапромысле і вучыўся на вячэрнім рабфаку. Адначасна наведваў хор клуба чыгуначнікаў. Пасля скончыў Азербайджанскі педагагічны інстытут (цяпер – Азербайджанскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт). Пяць гадоў працаваў настаўнікам у сярэдняй школе. У др. пал. 1930-х гг. паступіў у Азербайджанскую дзяржаўную кансерваторыю (цяпер – Бакінская музычная акадэмія)[1]. У 1938 г. быў запрошаны салістам у Азербайджанскі дзяржаўны тэатр оперы і балета (цяпер – Азербайджанскі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета імя М.Ф. Ахундава). У 1942 г. стаў салістам Дзяржаўнага хору СССР (цяпер – Дзяржаўны акадэмічны рускі хор імя А.В. Свешнікава). [У др. пал. 1942 г.] перайшоў на працу ў Кіргізскі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета (цяпер – Кіргізскі нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета імя Абдыласа Малдыбаева). У складзе франтавой брыгады артыстаў Кіргізскай ССР выступаў перад байцамі Бранскага і Калінінскага франтоў. [З 1944 г.] быў салістам Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра СССР (цяпер – Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр Расіі), у 1947–1948 гг. – Молатаўскага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета (цяпер – Пермскі акадэмічны тэатр оперы і балета імя П.І. Чайкоўскага). У 1949 г. рашэннем Галоўнага ўпраўлення тэатраў СССР накіраваны салістам у Дзяржаўны Вялікі тэатр оперы і балета БССР (цяпер – Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь), дзе працаваў да выхаду на пенсію ў 1961 г. У 1950 г. паступіў і праз год скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А.В. Луначарскага (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі) па спецыяльнасці “сольныя спевы” (вучань Я.Э. Віцінга), з 1962 г. да [1969 г.] выкладаў у ёй.

Найбольш вядомыя партыі, выкананыя М.А. Зюванавым у Азербайджанскім дзяржаўным тэатры оперы і балета ў 1938–1942 гг.: Грэміна (“Евгений Онегин” П.І. Чайкоўскага), Сабакіна (“Царская невеста” М.А. Рымскага-Корсакава), Варлаама (“Борис Годунов” М.П. Мусаргскага), Рамфіса (“Аида” Дж. Вэрдзі) і інш.; у Молатаўскім Дзяржаўным тэатры оперы і балета ў 1947–1948 гг.: Сабакіна (“Царская невеста”, М.А. Рымскага-Корсакава), Рэнэ (“Иоланта” П.І. Чайкоўскага) і інш.; у Дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета БССР: Івана Сусаніна (“Иван Сусанин” М.І. Глінкі) (1950), Карася (“Запорожец за Дунаем” С.С. Гулак-Арцямоўскага) (1951), Данілы (“Дзяўчына з Палесся” Я.К. Цікоцкага) (1953), Дурава (“Надежда Дурова” А.В. Багаты-

[1] Звесткі пра 1906–1938 гг. узяты з нарысаў Д.М. Жураўлёва: “Міхаіл Акімавіч Зюванаў” (БДАМЛМ, Ф. 341, В. 1, Спр. 14, С. 17–19) і “Шлях акцёра (М.А. Зюванаў)” // “Майстры беларускай сцэны” / Пад рэд. А. Звонака, Я. Рамановіча і інш. – Мінск: “Дзяржаўнае выдавецтва БССР”, 1960. – С. 91.

рова) (1956), Варажскага госця (“Садко” М.А. Рымскага-Корсакава) (1957) і інш.

М.А. Зюванаў падрыхтаваў многіх вядомых спевакоў: заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь і народнага артыста Расіі А.А. Дзедзіка, заслужаную артыстку Расіі Н.К. Ерасаву, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь М.А. Жылюка, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь і народнага артыста Украіны М.А. Каваля і інш.

У 1951 г. атрымаў званне “Заслужаны артыст БССР”, у 1954 г. – “Народны артыст БССР”. У 1946 г. узнагароджаны медалём “За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”, у 1955 г. – ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

М.А. Зюванаў памёр 29 красавіка 1977 г. Пахаваны ў г. Мінску.

**Зюванава Яўгенія Мікалаеўна** (да шлюбу – Паспелава) нарадзілася 4 лютага 1928 г. у сям’і рабочых у г. Свярдлоўску (цяпер – Екацярынбург) (Расія). З 1935 г. вучылася ў Свярдлоўскім харэаграфічным вучылішчы (цяпер – Уральскі харэаграфічны каледж). У сувязі з закрыццём вучылішча ў 1943 г. была прынята на пасаду артысткі балета ў Свярдлоўскі тэатр оперы і балета імя А.В. Луначарскага (цяпер – Екацярынбургскі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета). З 1946 г. да 1949 г. працавала салісткай балета ў Молатаўскім тэатры оперы і балета, з 1949 г. да выхада на пенсію ў 1963 г. – салісткай балета Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР.

Найбольш вядомыя балетныя ролі Я.М. Зюванавай, выкананыя ў Дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета БССР: Танечка (“Доктор Айболит” І.У. Марозава) (1951), Тао Хоа (“Красный мак” Р. Гліэра) (1953), Котка (“Спящая красавица” П.І. Чайкоўскага) (1954) і інш.

У 1946 г. узнагароджана медалём “За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”, у 1955 г. – Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Дакументы М.А. і Я.М. Зюванавых паступілі ў БДАМЛМ ад Я.М. Зюванавай ў 1991 г. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 59 спраў (134 дак.) за 1942–1976 гг.

Вопіс складаецца з 2 раздзелаў:

Першы раздзел – “Дакументы М.А. Зюванава” – складаецца з 4-х падраздзелаў, у якіх змешчаны фатаграфіі роляў і сцэн з спектакляў, сыграных М.А. Зюванавым у Дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета БССР; дакументы ўкладальніцкай дзейнасці М.А. Зюванава; дакументы да яго біяграфіі (афішы і праграмы спектакляў, граматы і інш.); дакументы пра і з яго ўпамінаннем і некалькі індывідуальных фатаграфій М.А. Зюванава. Справы ў раздзеле сфарміраваны па жанрах і храналогіі за 1942–1976 гг.

Другі раздзел – “Дакументы Я.М. Зюванавай” – прадстаўлены фатаграфіямі роляў і сцэн з спектакляў, сыграных ёй у Дзяржаўным Вялікім тэатры

оперы і балета БССР, праграмамі канцэрта і балетнага спектакля з яе ўдзелам і інш. Справы ў раздзеле сфарміраваны па жанрах і храналогіі за 1951–1956 гг.

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава
04.10.2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ М.А. ЗЮВАНАВА** | | | | |
| | **1.1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ М.А. ЗЮВАНАВА** | | | | |
| | **1.1.1. ФАТАГРАФІІ М.А. ЗЮВАНАВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З ОПЕРНЫХ СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА ВЯЛІКАГА ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР** | | | | |
| 1 | Фатаграфіі М.А. Зюванава ў ролі Івана Сусаніна ("Иван Сусанин" М.І. Глінкі, рэж. Б.А. Мардвінаў), сыгранай у тэатры оперы і балета БССР, і сцэн з гэтага опернага спектакля з удзелам М.А. Зюванава і Т.М. Пастунінай (у ролі Антаніды) | 1950 | 3 | 3 | |
| 2 | Фатаграфія сцэны з опернага спектакля "Запорожец за Дунаем" С.С. Гулак-Арцямоўскага (рэж. Л.П. Александроўская), пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР, з удзелам М.А. Зюванава (у ролі Карася), Л.П. Александроўскай (у ролі Адаркі) і інш. | 1951 | 1 | 1 | |
| 3 | Фатаграфіі М.А. Зюванава ў ролі Данілы ("Дзяўчына з Палесся" Я.К. Цікоцкага, рэж. Л.П. Александроўская), сыгранай у тэатры оперы і балета БССР | 1953, 1955 | 2 | 2 | |
| 4 | Фатаграфія сцэны з опернага спектакля "Надежда Дурова" А.В. Багатырова (рэж. Л.П. Александроўская), пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР, з удзелам М.А. Зюванава (у ролі Дурава) і неўстаноўленага спевака | 1956 | 1 | 1 | |
| 5 | Фатаграфіі М.А. Зюванава ў ролі Варажскага госця ("Садко" М.А. Рымскага-Корсакава, рэж. А.М. Маралёў), сыгранай у тэатры оперы і балета БССР, і сцэны з гэтага опернага спектакля з удзелам М.А. Зюванава і інш. | 1957 | 4 | 3 | |
| 6 | Фатаграфіі М.А. Зюванава ў ролі Кавалера дэ Грые ("Манон" Ж. Масснэ, рэж. Ю.П. Ужанцаў) і ў ролі Анішчука ("Михась Подгорный" Я.К. Цікоцкага, рэж. П.С. Златагораў), сыграных у тэатры оперы і балета БССР | 1957, 1958 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 7 | Фатаграфіі М.А. Зюванава ў ролі Мефістофеля ("Фауст" Ш. Гуно, рэж. У.М. Шахрай), сыгранай у час гастроляў тэатра оперы і балета БССР у г. Іванаве (Расія), і сцэны з гэтага опернага спектакля з удзелам М.А. Зюванава і неўстаноўленага спевака. Дзве фатаграфіі з клеймом фатографа [М.] Неўскага | 1950 | 4 | 4 | |
| 8 | Фатаграфія М.А. Зюванава ў ролі Грэміна ("Евгений Онегин" П.І. Чайкоўскага, рэж В. Брэгы), сыгранай у час гастроляў артыстаў тэатра оперы і балета БССР у г. Познані (Польшча). Фатограф Г. Вышамірская | 1955 | 1 | 1 | |
| | **1.1.2. ДАКУМЕНТЫ ЎКЛАДАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ М.А. ЗЮВАНАВА** | | | | |
| 9 | "Хрестоматия вокально-педагогического репертуара для баса. III курс консерватории". Укладальнік М.А. Зюванаў. Рукапіс М.А. Зюванава і ксеракопіі вакалізаў, песняў для голасу з фартэпіяна і інш. з нязначнай уклейкай | [пасля 1966 г.] | 159 | 1 | |
| 10 | "Хрестоматия вокально-педагогического репертуара для баса. IV курс консерватории". Укладальнік М.А. Зюванаў. Рукапіс М.А. Зюванава і ксеракопіі вакалізаў, песняў для голасу з фартэпіяна і інш. з нязначнай уклейкай | [пасля 1966 г.] | 193 | 1 | |
| | **1.2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ М.А. ЗЮВАНАВА** | | | | |
| | **1.2.1. ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ ВЯЛІКІМ ТЭАТРЫ ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР І ІНШ.** | | | | |
| 11 | Праграма опернага спектакля "Царская невеста" М.А. Рымскага-Корсакава філіяла Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра СССР з удзелам М.А. Зюванава | 1944 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 12 | Афішы оперных спектакляў "Проданная невеста" Б. Сметаны тэатра оперы і балета БССР з удзелам М.А. Зюванава | 1949, 1952 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 13 | Афішы опернага спектакля "Русалка" А.С. Даргамыжскага тэатра оперы і балета БССР з удзелам М.А. Зюванава | 1949-1955 | 3 | 3 | |
| 14 | Праграма опернага спектакля "Запорожец за Дунаем" С.С. Гулак-Арцямоўскага тэатра оперы і балета БССР з удзелам М.А. Зюванава | 1951 | 11 | 1 | |
| 15 | Афішы рэпертуарных оперных спектакляў "Иоланта", "Мазэпа" і інш. П.І. Чайкоўскага, "Тихий Дон" І.І. Дзяржынскага і інш. тэатра оперы і балета БССР у т.л. з удзелам М.А. Зюванава | 1952, 1953 | 3 | 3 | |
| 16 | Афішы опернага спектакля "Борис Годунов" М.П. Мусаргскага тэатра оперы і балета БССР з удзелам М.А. Зюванава | 1954, 1956 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 17 | Праграма опернага канцэрта артыстаў тэатра оперы і балета БССР у Дзяржаўнай філармоніі г. Лодзі (Польшча) з удзелам М.А. Зюванава | 1955 | 3 | 1 | |
| 18 | Афішы оперных спектакляў "Евгений Онегин" і "Борис Годунов" і інш. у час гастроляў тэатра оперы і балета БССР у г. Познані (Польшча) з удзелам М.А. Зюванава | 1955 | 4 | 4 | |
| 19 | Дакументы аб удзеле М.А. Зюванава - саліста тэатра оперы і балета БССР - у Дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Маскве (пасведчанне ўдзельніка, запрашэнне на прыём у рэстаран "Метрополь", праграма заключнага канцэрта і інш.) | 1955 | 8 | 4 | |
| 20 | Афіша спектакляў "Русалка" А.С. Даргамыжскага і "Фауст" Ш. Гуно Куйбышаўскага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета (Расія) з удзелам саліста тэатра оперы і балета БССР М.А. Зюванава | 1955 | 1 | 1 | |
| 21 | Афіша оперных спектакляў "Борис Годунов" М.П. Мусаргскага і "Иван Сусанин" М.І. Глінкі Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета УССР імя Т.Р. Шаўчэнкі з удзелам саліста тэатра оперы і балета БССР М.А. Зюванава | 1955-1956 | 1 | 1 | |
| 22 | Афіша опернага спектакля "Фауст" Ш. Гуно Адэскага Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета (Украіна) з удзелам М.А. Зюванава | 1958/1959 | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1.2.2. АФІШЫ І ПРАГРАМЫ КАНЦЭРТАЎ** | | | | |
| 23 | Праграмы канцэртаў, прысвечаных 26-й і 29-й гадавіне з дня смерці У.І. Леніна, 34-й і 36-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі і інш., з удзелам М.А. Зюванава | 1950-1954 | 13 | 6 | |
| 24 | Афіша канцэрта майстроў мастацтваў БССР у Беларускай дзяржаўнай філармоніі з удзелам М.А. Зюванава | 1955 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 25 | Афіша канцэрта студэнтаў вакальнага аддзялення Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В. Луначарскага (клас М.А. Зюванава) | 1974 | 1 | 1 | |
| | **1.2.3. ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯ, ГРАМАТЫ І ІНШ.** | | | | |
| 26 | Віншавальныя адрасы Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В. Луначарскага, Беларускага тэатральнага таварыства і Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР М.А. Зюванаву ў сувязі з 70-годдзем з дня яго нараджэння. Адзін - за подпісам Л.П. Александроўскай | 1976 | 4 | 3 | |
| 27 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР М.А. Зюванаву "за заслугі ў развіцці опернага мастацтва і ў сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння" | 1976 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 28 | "Документы фронтовой бригады деятелей искусств Киргизии" з загадам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Кіргізскай ССР аб узнагароджанні ўдзельнікаў брыгады (у т.л. М.А. Зюванава) ганаровымі граматамі і інш. Брашура | 1942 | 6 | 1 | |
| 29 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета Кіргізскай ССР артысту Кіргізскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета М.А. Зюванаву "за ўзорнае мастацкае абслугоўванне частак Чырвонай арміі ў дні Вялікай Айчыннай вайны" | 1942 | 2 | 1 | |
| 30 | Падзяка Дырэкцыі дзяржаўных музычных калектываў СССР М.А. Зюванаву "за актыўны і плённы ўдзел у першай дэкадзе савецкай музыкі рэспублік Сярэдняй Азіі ў дні Вялікай Айчыннай вайны". На вокладцы - пералік песен | 1942 | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | [з выступленняў М.А. Зюванава] (аўтограф М.А. Зюванава). Л. 1 | | | | |
| 31 | Ганаровая грамата Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР і ЦК прафсаюзаў работнікаў мастацтваў СССР М.А. Зюванаву "за выдатную работу па культурна-шэфскаму абслугоўванню частак Чырвонай арміі, Ваенна-марскога флоту і войск НКУС у перыяд Вялікай Айчыннай вайны" | 1943 | 2 | 1 | |
| 32 | Ганаровыя граматы Выканкама Молатаўскага абласнога савета дэпутатаў працоўных і Молатаўскага абласнога Камітэта ВКП(б) М.А. Зюванаву "за плённую працу ў Молатаўскім Дзяржаўным тэатры оперы і балета" | 1947, 1948 | 2 | 2 | |
| 33 | Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні М.А. Зюванаву звання "Заслужаны артыст БССР" і ўзнагароджанні яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Выразкі з газет | 1951, 1955 | 2 | 2 | |
| 34 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР М.А. Зюванаву аб прысваенні звання "Заслужаны артыст БССР" | 1951 | 2 | 1 | |
| 35 | Ганаровая грамата, грамата і пахвальны ліст Іванаўскага гарадскога камітэта, Кіраўскага абкама ВЛКСМ і інш. (Расія) М.А. Зюванаву "за актыўны ўдзел у шэфскай рабоце і высокае мастацкае майстэрства", "высокае сцэнічнае мастацтва, паказанае на гастролях", і інш. | 1951-1959 | 3 | 3 | |
| 36 | Ганаровыя граматы і граматы Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай арміі і Ваенна-марскога флоту, Камітэта па справах мастацтваў пры Савеце міністраў СССР і інш. М.А. Зюванаву "за выдатную работу па культурнаму шэфству над Савецкай арміяй і Ваенна-марскім флотам" і інш. | 1953-1960 | 7 | 7 | |
| 37 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР М.А. Зюванаву аб прысваенні звання "Народны артыст БССР" | 1954 | 2 | 1 | |
| 38 | Пастановы Прэзідыума ЦК прафсаюза работнікаў культуры аб аб'яўленні падзякі М.А. Зюванаву "за актыўны ўдзел у рабоце па культурнаму шэфству над Узброеннымі Сіламі СССР" | 1960, 1961 | 2 | 2 | |
| 39 | Ганаровыя граматы і грамата Беларускай | 1963-1975 | 4 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | сельскагаспадарчай акадэміі, Міністэрства культуры СССР і інш. М.А. Зюванаву "за прапаганду музыкі і культурных ведаў", "шматгадовую плённую працу ў галіне культуры і мастацтва" і інш. | | | | |
| | **1.3. ДАКУМЕНТЫ ПРА М.А. ЗЮВАНАВА І ІНШ.** | | | | |
| 40 | Сцэнарый радыёперадачы "Мая любімая песня" з удзелам М.А. Зюванава. Без канца. Машынапіс з нязначнай праўкай М.А. Зюванава | [1951-1954] | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 41 | "В Москву, на декаду!", "Праздник белорусского искусства" і інш. Артыкулы, нататка і інш. пра Дэкаду беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Маскве з упамінаннем М.А. Зюванава. Газеты "Вечерняя Москва" (№ 44, 1955), "Советская Белоруссия" (№№ 36, 41 і 44, 1955) і выразкі з газет | 1955 | 13 | 10 | |
| 42 | Бюлетэнь "Программы московских театров" (№ 6, 1955) з рэпертуарам спектакляў з Дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Маскве з упамінаннем М.А. Зюванава | | 34 | 1 | |
| 43 | Бюлетэнь "Театральна декада" (№ 29, 1955) з рэпертуарам тэатраў г. Кіева з упамінаннем М.А. Зюванава. На ўкраінскай мове | | 18 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 44 | [В.] Мазураў, А. Пятроў і інш. "Высокое мастерство", "Искусство братского народа" і інш. Артыкулы і нататкі пра гастролі Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР у г. Архангельску, г. Кіраве і інш. Выразкі з газет | 1951-1956 | 4 | 4 | |
| 45 | Артыкулы і нататкі пра Дэкаду беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Маскве. Газеты "Вечерняя Москва" (№ 41, 1955), "Советская Белоруссия" (№ 35, 1955) і выразкі з газет | 1955 | 11 | 8 | |
| | * * * | | | | |
| 46 | Г.В. Кісялёў, А. Саладоўнікаў і інш. "Правдивое искусство. На спектаклях Белорусского театра имени Янки Купалы", "Творчество - на службу современности" і інш. Артыкулы, нататкі і інш. | 1951-1956 | 4 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Газета "Советская культура" (№ 118, 1956) і выразкі з газет | | | | |
| 47 | Праграма опернага спектакля "Аіда" Дж. Вэрдзі Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета УССР імя Т.Р. Шаўчэнкі. На ўкраінскай мове. Праграма опернага спектакля "Eugeniusz Oniegin" ("Яўген Анегін") Дзяржаўнай оперы імя С. Манюшкі ў г. Познані (Польшча). На польскай мове | 1955 | 4 | 2 | |
| | **1.4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 48 | Фатаграфіі М.А. Зюванава, індывідуальныя, у час гастроляў у Адэскім акадэмічным тэатры оперы і балета і інш. | 1958/1959-[пач. 1970-х гг.] | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 49 | Фатаграфія М.А. Зюванава ў групе з выкладчыкамі і выпускнікамі пасля сканчэння ім Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В. Луначарскага | 1951 | 2 | 1 | |
| 50 | Фатаграфія М.А. Зюванава (у касцюме Базіліо) у групе з акцёрамі І. Казлоўскім (у касцюме графа Альмавівы), Т.М. Ніжнікавай (у касцюме Разіны), М.М. Сербавым (у касцюме Фігаро) і інш. пасля опернага спектакля "Севильский цирюльник" Дж. Расіні, пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР | [1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| 51 | Фатаграфія М.А. Зюванава (у касцюме Грэміна) у групе з [дырыжорам Ж. Вайцэхоўскім], К.К. Кудрашовай (у касцюме Няні), Т.І. Шымко (у касцюме Таццяны) і інш. пасля опернага спектакля "Евгений Онегин" у час гастроляў артыстаў тэатра оперы і балета БССР у г. Познані (Польшча). Фатограф Г. Вышамірская | 1955 | 1 | 1 | |
| 52 | Фатаграфіі М.А. Зюванава ў групах з А.В. Абразцовай, У.А. Атлантавым, Я.А. Вашчакам, Г.П. Вішнеўскай, А.П. Івановым, Я.Ц. Райковым, Н.А. Ткачэнкай і інш. у час членства ў журы 2-га Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя М.І. Глінкі ў г. Маскве | 1962 | 4 | 4 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ Я.М. ЗЮВАНАВАЙ** | | | | |
| 53 | Фатаграфія Я.М. Зюванавай у неўстаноўленай ролі (балетны спектакль "Вальпургиева ночь" да опернага спектакля "Фауст" Ш. Гуно, рэж. У.М. Шахрай) і ролі Танечкі ("Доктор Айболит" І.У. Марозава, балетмайстар К.А. Мулер), сыграных | [пач. 1950-х гг.], 1955 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | у тэатры оперы і балета БССР | | | | |
| 54 | Фатаграфіі Я.М. Зюванавай у ролі Тао Хоа ("Красный мак" Р. Гліэра, балетмайстар С.У. Дрэчын), сыгранай у тэатры оперы і балета БССР | 1953 | 3 | 3 | |
| 55 | Фатаграфіі сцэн з балетнага спектакля "Спящая красавица" П.І. Чайкоўскага (балетмайстар К.А. Мулер) з удзелам Я.М. Зюванавай у ролі Коткі [і інш.] і неўстаноўленых акцёраў, пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР | 1954 | 2 | 2 | |
| 56 | Фатаграфія сцэны з балетнага спектакля "Лауренсия" А.А. Крэйна (балетмайстар С.У. Дрэчын) з удзелам Я.М. Зюванавай і Г.А. Чарнаяравай у неўстаноўленых ролях, пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР | 1956 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 57 | Праграма заключнага канцэрта агляду творчай моладзі тэатраў і мастацкіх арганізацый БССР з удзелам Я.М. Зюванавай | 1952 | 3 | 1 | |
| 58 | Праграма і змест балетнага спектакля "Доктор Айболит" І.У. Марозава тэатра оперы і балета БССР з удзелам Я.М. Зюванавай | 1955 | 7 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 59 | Рэцэнзіі Р. Піётухоўскай і Я.К. Цікоцкага на балетны спектакль "Доктор Айболит" з упамінаннем Я.М. Зюванавай. Выразкі з газет | 1951 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 59 (пяцьдзесят дзевяць)

спраў з № 1 па № 59 , 134 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.